

Жыве Беларусь!

Народная Газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№37(550) 23 лютага 1993 г. Аўторак. | Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. | Тыраж 607902 экз. | Кошт у розніцу — 4 руб.

Прилетели. Спустились на землю

Названо имя угонщика самолета Аэрофлота ТУ-134, который вынудил экипаж лайнера приземлиться в минувшую субботу в стокгольмском аэропорту Арланда.

Это 28-летний Тамеран Мусаев из Азербайджана. Пока им занимается столичный суд, союз шведских пилотов и союз авиадиспетчеров страны потребовали от правительства Швеции немедленной высылки угонщика за пределы Северного Королевства.

Николай ВУКОЛОВ.

Дорогие слова, вовремя сказанные...

Председатель Верховного Совета Таджикистана Эмомали Рахмонов направил президенту США Биллу Клинтону телеграмму, в которой выразил признательность в связи с выделением Таджикистану 25 млн. долларов на благотворительные цели.

Эмомали Рахмонов подтвердил стремление руководства республики к построению светского демократического государства, в котором будут соблюдаться права граждан всех национальностей и вероисповеданий.

Чужой войны не бывает?

По сообщению радио "Свобода", российские власти изучают сейчас сведения о наличии в стране негосударственных вербовочных пунктов для отправки добровольцев на территорию бывшей Югославии.

Информация о том, что российские граждане сражаются на стороне боснийских сербов, уже предоставлена президенту Б.Ельцину. Однако до завершения проверки этих сведений представители власти отказались их комментировать.

Газовые атаки?

Вчера возобновилась подача газа в Армению по газопроводу, проходящему по территории Грузии.

Этот газопровод — единственный, по которому в республику поступает данный вид топлива, — за последний месяц был взорван трижды. Армения обвиняет грузинские власти в плохом обеспечении его охраны.

Ирина КОРЗИНКИНА.

Объединенные демократы зовут за "круглый стол"

Совет Объединенной демократической партии Беларуси принял заявление по результатам последней сессии Верховного Совета республики.

ОДПБ, как заявлено в документе, выступает за скорейшее введение института президентства в республике: "Сильная демократическая исполнительная власть, — по мнению совета ОДПБ, — в лице всенародно избранного президента при наличии профессионального парламента, Конституционного суда и реального местного самоуправления способна начать серьезные реформы, вывести общество из кризиса". Для обсуждения механизма законодательного оформления этой идеи демократы предложили провести "круглый стол" с участием представителей Комиссии по законодательству Верховного Совета, парламентских фракций, политических партий и движений.

БелаПАН.

Ходить так приятно — туда и обратно

В Минске утверждены новые цены на проезд в городском транспорте.

С 1 марта одна поездка в автобусе, троллейбусе, трамвае или метро будет стоить пять рублей. Месячный проездной на один вид транспорта обойдется пассажиру в 275 рублей, на четыре — в 500. В ближайшее время Мингорисполком намерен откорректировать и размер транспортных штрафов.

Ольга РОГОВА.

Памяць



Прэзідэнты таксама знаходзяць бацькоў. Хоць праз доўгія дзесяцігоддзі...

— Я ўжо ні на што не спадзяваўся... — гэтыя радасныя (калі іх можна назваць раданымі) словы сказаў прэзідэнт Украіны Леанід Краўчук у гарадскім пасёлку Акцябрскі на брацкай магіле савецкіх воінаў, сярод якіх ляжыць і яго бацька. — Куды толькі ні звяртаўся, куды толькі ні пасылаў запытанні, адусюль прыходзіла: у архівах такога няма...

І толькі праз сорак восем гадоў падчас падрыхтоўкі абласной "Кнігі памяці" ровенскаму журналісту ўласнаму карэспандэнту "Рабочай газеты" Івану Пашчуку папалі ў рукі архіўныя дакументы аб загінуўшых земляках. У іх сярод іншых аказалася і прозвішча Краўчука Макара Аляксеевіча. Праверылі — аказалася, гэта бацька прэзідэнта.

Служыў ён радавым у 480-м стралковым палку 152-й Днепрапятроўскай дывізіі. Пасля гібелі ў 1944 годзе пад вёскай Гаць быў пахаваны як невядомы.

У нядзелю прэзідэнт Украіны Леанід Краўчук разам з жонкай і ўнукам наведаў магілу свайго бацькі. Сустракалі яго на беларускай зямлі Старшыня Вярхоўнага Савета рэспублікі Станіслаў Шушкевіч, старшыня Гомельскага аблвыканкама Мікалай Вайцянкоў, кіраўніцтва Акцябрскага раёна.

Не было падчас гэтага візіту ніякіх міждзяржаўных перагавораў. Была агульная боль і памяць. Мы жывём побач, мы гінулі на адной зямлі, нам і далей жыць разам...

Фота Сяргея ПЛЫТКЕВІЧА.

Вкратце

Пресс-служба рабочей группы СНГ уточнила, что вопреки появившимся слухам переноса запланированной на 30 апреля встречи в верхах из Еревана в столицу Туркменистана не произойдет.

Сейчас координирующие органы Советов руководителей государств и руководителей правительств работают в тесном контакте с созданным в Армении оргкомитетом по подготовке и проведению встречи руководителей государств.

❑

На днях завершился визит правительственной делегации Республики Башкортостан в Беларусь.

В ходе его обсуждались меры по выполнению соглашения о торгово-экономическом сотрудничестве между суверенными государствами в текущем году.

❑

В Италии завершился конгресс трансконтинентальной радикальной партии, участие в котором впервые приняли представители Беларуси.

Хотя ни один из наших делегатов так и не смог выступить со своим докладом, минчанка Светлана Коптель избрана членом Федерального совета партии.

Если голосовать тайно...

В прошлую субботу в известном в республике колхозе имени Гастелло Минского района, который долгие годы бессменно возглавлял Е.С.Лифшиц, прошло очередное отчетно-выборное собрание.

По традиции было предложено выбрать открытым голосованием на новый срок прежнего председателя, с чем, однако, собрание не согласилось. Результаты тайного голосования оказались шокирующими для членов правления и их головы. Строительство роскошных особняков на территории колхоза представителями столичной номенклатуры не прошло бесследно. Новым руководителем хозяйства избран инженер Павел Иванович Невестенко.

Надо полагать, основания для тайного голосования при избрании своих руководителей есть и во многих других хозяйствах республики.

Сергей АНТОНЧИК.

Медицинский прогноз погоды на 23 февраля

Погода в Минске и области будет формироваться под влиянием циклона. Ожидается незначительное колебание основных метеоэлементов (температуры и влажности воздуха, атмосферного давления). Содержание кислорода в воздухе будет ниже средних многолетних данных. Неблагоприятный день в геофизическом плане.

В таких погодных условиях может ухудшиться самочувствие больных с заболеваниями дыхательной и сердечно-сосудистой систем (слабость, раздражительность, нарушение сна). Сегодня следует ограничить физические нагрузки, почаще проветривать квартиру и рабочее помещение, соблюдать диету, не употреблять спиртного, но принимать лекарства, назначенные врачом, включая успокаивающие средства.

Антонина КАРОЗА,
научный сотрудник БелНИИ кардиологии.

Спорт-экспресс

Проиграв каунасскому "Жальгирису" в Каунасе — 84:88 и в Минске — 88-94 (43:44), баскетболисты минского РТИ выбыли из дальнейшей борьбы за звание чемпиона Международной профессиональной баскетбольной лиги.

❑

Вчера гандболистки минского "Политехника" в первом матче 1/4 финала Кубка ИГФ выиграли на своей площадке у "Рапида" (Бухарест) — 28:21 (16:13). Ответная встреча состоится через неделю в Бухаресте.

❑

В республиканском Дворце шахмат и шашек торжественно открылся первый Международный шахматный фестиваль "Минск-93", который обещает стать традиционным. В программе фестиваля — один гроссмейстерский турнир, два — мастерских, один — открытый и один — народный. Список шахматных "звезд" невелик — это международные гроссмейстеры датчанин Нильсен, латыш Гипслис, А.Суэтин и И.Зайцев из России. Последний, кстати, тренировал экс-чемпиона мира Анатолия Карпова.

Выпуск подготовлен по сообщениям корреспондентов "Народной газеты", агентств ИТАР—ТАСС, Белинформ, БелаПАН и РИД.

Падводзячы вынікі

Дзесятая сесія прайшла канструктыўна

**Вячаслаў КУЗНЯЦОЎ,
першы намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь**

Кожная сесія беларускага парламента, як бы ў першым прыбліжэнні ні ацэньваць яе практычны вынік, замацоўвае асновы нашай маладой дзяржаўнасці. Не стала выключэннем і 10-я сесія Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, якая нядаўна закончылася.

❑

Даючы ацэнку таму ці іншаму яе рашэнню, неабходна, на мой погляд, разглядаць кожнае з іх у дынаміцы, ва ўзаемасувязі палітычных, сацыяльных і эканамічных працэсаў, якія адбываюцца сёння ў нашым грамадстве. Прычым дыяпазон думак і ацэнак можа быць вельмі шырокі. І гэта не дзіўна. На разгляд сесіі выносіліся пытанні, якія ў доўгачасовым плане вызначаюць будучае нашай краіны. Улічваючы палітычную мнагамернасць і грамадства, і парламента, было б наіўным меркаваць, што сам працэс рэфарміравання будзе простай і лёгкай справай. Тым больш не трэба забываць, што ў дэмакратычнай дзяржаве, а мы імкнёмся да яе пабудовы, усе рашэнні могуць быць прыняты толькі кансенсусам, калі сіла прымушэння і дыктату ўступае сіле аргументаў.

❑

На парадак дня 10-й сесіі было вынесена ледзь не 100 пытанняў. Сесія паставіла своеасаблівы рэкорд і па працягласці сваёй работы. Дэпутаты як бы імкнуліся наверстаць час, які пайшоў на канікулы, што зацягнуліся, як лічылі некаторыя, паміж цяперашняй і мінулай сесіямі. Аднак павінен заўважыць, што працяглы перапынак паміж пасяджэннямі парламента зусім не азначае затухання заканатворчай дзейнасці значнай колькасці дэпутатаў, якія працуюць у камісіях на пастаяннай аснове. Для таго, каб сама сесія працавала рытмічна, без перапынку, кожны з пунктаў парадку дня павінен быць бездакорна падрыхтаваны юрыдычна, увязаны канцэптуальна з іншымі законамі, падвергнуты прыдзірлівай экспертызе.

Хачу адзначыць накіраванасць большасці дэпутатаў на прадукцыйную работу, якая праявілася з самага пачатку сесіі. Былі пасаромлены тыя, хто чакаў "вялікіх узрушэнняў" ужо пры абмеркаванні парадку дня. Сфарміраваўшы яго хутка і па-дзелавому, парламентарыі на першае месца паставілі пытанні, якія ідуць ад жыцця і закранаюць інтарэсы людзей. Аб мінімальнай заработнай плаце, аб праекце новай Канстытуцыі, блок эканамічных праблем — вось прыярытэты, якія заслужылі ў першыя дні 10-й сесіі першачарговага абмеркавання.

Наогул жа адметнай асаблівасцю 10-й сесіі лічу дамінаванне ў яе рабоце эканамічнай праблематыкі. Якое б пытанне ні разглядала сесія, мы немінуча падыходзілі да стану эканомікі, бюджэту, і часта менавіта эканоміка, фінансы і грашовае абарачэнне станавіліся адзіным крытэрыем правільнасці і дапушчальнасці прымаемых рашэнняў. Усё большая колькасць дэпутатаў разумее, што ў канчатковым выніку менавіта ад стану эканомікі будуць залежаць і набыццё Беларуссю рэальнага, а не дэкларaванага суверэнітэту, і вырашэнне сацыяльных праблем, і стабільнасць у грамадстве.

Практычныя падыходы да стабілізацыі вытворчасці, зніжэння тэмпаў інфляцыі, ажыццяўлення мер сацыяльнай абароны насельніцтва закладзены зацверджанай Вярхоўным Саветам Эканамічнай праграмай урада Рэспублікі Беларусь на 1993 год. Хаця прапанаваная праграма выключна складаная для рэальнага ажыццяўлення, але, думаецца, яе рэалізацыя дазволіць пазбегнуць празмернага сацыяльнага напружання ў грамадстве, аблегчыць і паскорыць наш пераход да рынку.

Аб тым, што рух да рынку не абмяжоўваецца толькі размовамі, сведчыць факт прыняцця Вярхоўным Саветам блока законаў рыначнага характару. Да іх адносяцца законы аб раздзяржаўленні і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці, аб акцыянерных таварыствах, аб антыманапольнай палітыцы. Пералічаныя законы настолькі важныя для эканамічных пераўтварэнняў і так нязвычныя для нашай гаспадарчай практыкі, што іх характарыстыка заслугоўвае асобнай публікацыі. Скажу толькі, што яны ствараюць надзейную прававую базу для фарміравання канкурэнтнага рыначнага асяроддзя ў эканоміцы рэспублікі, без якога немагчыма станаўленне паўнацэнных рыначных адносін. Закон аб прыватызацыі ўводзіць працэс рэфарміравання адносін уласнасці ў выразныя юрыдычныя рамкі і пасля яго ўвядзення ў поўным аб'ёме перакрые лазейкі для махінацый і раскрадання агульнадзяржаўнай уласнасці. Менавіта з-за масы негатыўных з'яў у ходзе прыватызацыі, на якія так востра рэагуе наша грамадства, гэты працэс быў прыпынены Вярхоўным Саветам у канцы 1992 года.

(Заканчэнне на 2-й стар)

Як грамадзянін і як галоўны рэдактар

Маленькія сусловы тупаюць ножкай

Я мяркую, што пасля артыкула "Не магу маўчаць!" ("Народная газета" за 16.02), у якім ішла гаворка пра рэанімацыю заганнай практыкі дыктаваць "зверху" волю рэдакцыям, ва Упраўленні інфармацыі Саўміна зробяць правільны вывад. Напрыклад, зазірнуць у Закон аб друку, які дзейнічае на тэрыторыі Беларусі, азнаёмяцца з артыкулам 36, дзе сказана, што прымус журналістаў да распаўсюджвання інфармацыі вядзе за сабой крымінальную адказнасць і караецца штрафам да 500 рублёў. Спадзяваўся і на тое, што Упраўленне хоць бы адмяжуецца ад дзеянняў тых, хто ва ультыматыўнай форме вырашыў выселіць "Народную газету" за "непаслушэнства". Але самае галоўнае, вядома, у іншым — я і рэдакцыя спадзяваліся на тое, што кіраўніцтва Упраўлення інфармацыі больш цвяроза ацэніць сваю дзейнасць, якая выклікае сапраўдную трывогу і занепакоенасць не толькі ў нашым калектыве, але і сярод грамадскасці, пра што, у прыватнасці, сведчаць і выступленні народных дэпутатаў на сесіі Вярхоўнага Савета, і водгукі, паступіўшыя ў рэдакцыю апошнімі днямі.

Калі называць рэчы сваімі імёнамі, то кіраўніцтва Упраўлення інфармацыі ў сваёй ідэалагічнай рабоце даволі мэтанакіравана паўтарае стыль суслаўскай практыкі. У гэтым мяне, як, упэўнены, і многіх прынцыповых журналістаў іншых выданняў, радыё і тэлебачання, яшчэ раз пераконвае справаздача з брыфінгу, распаўсюджаная зноў жа па каналах Белінфарма і апублікаваная ў тых жа газетах, заснавальнікам якіх з'яўляецца Савет Міністраў. Дзіўная сітуацыя — мой артыкул надрукаваны толькі ў "Народнай газеце", а "водпаведзь" аўтару даецца ў "Советской Белоруссии" і "Рэспубліцы". Такі ход яшчэ можна было б, зразумець, калі б "Народная" адмовіла ў надрукаванні, дык ніхто гэтым нават не пацікавіўся.

У апанентаў можа ўзнікнуць контраргумент: дык брыфінг быў прысвечаны не толькі публікацыі "Народнай газеты". Гэта так, але ж чаму чытачам "Советской Белоруссии", "Рэспублікі" і іншых выданняў трэба ўводзіць у вушы тое, пра што яны не маюць уяўлення?

І ўсё ж не час сёння высвятляць адносіны з калегамі-рэдактарамі. Я хачу сказаць пра іншае, больш важнае. Выступленне начальніка Упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязей В.Драгаўца на брыфінгу, які адбыўся 17 лютага, і справаздача з яго, растыражаваная затым па саўмінаўскіх газетах, — гэта характэрны ўзор камуністычнага "кіраўніцтва прэсай". Той жа набор круглых і бессэнсоўных фармулёвак, запалохваючыя інтанацыі, недагаворкі і, прабачце, адкрытая хлусня (але пра гэта пазней). Усё гэта Белінфарм павінен, бачыце, данесці да газет, якія абавязаны паднесці начальніцкія "меркаванні" чытачу. Якое гэта ўсё знаёмае па ранейшых часах, як гэта адмыслова атрымліваецца ў былога сакратара ЦК камсамола па ідэалогіі, ўпэўненага, што сёння ён дасягнуў такога ўзроўню, каб павучаць усіх і кожнага. Але Васіль Мікалаевіч забыўся пра адно: як бы ён ні хацеў, але манапольнае права кіраваць прэсай не можа належаць яму, як і каму-небудзь іншаму. І роля маленькага Суслава ў сённяшняй Беларусі выглядае не да месца, а іншы раз і смешна. Сёння нельга так проста ні заткнуць рот тым, хто не згодны, ні выгнаць газету з таго або іншага "кіруючага" дома.

У сваім "інструктажы" на брыфінгу В.Драгавец назваў выступленне "Народнай газеты" "спробай дэзарганізаваць работу Савета Міністраў". Мне здаецца, што Васіль Мікалаевіч памыляецца. Ён — яшчэ зусім не Савет Міністраў. І ўскладаць на свае плечы такую адказнасць пакуль што ранавата. А рабіць такія вось абвінавачванні ў адрас газеты, мякка кажучы, неабдумана. Так лёгка дайсці і да абвінавачвання ў шпіянажы, ідэалагічных дыверсіях і шкодніцтве. Не трэба бухаць з гармат па вераб'ях. Не салідна.

Што ж датычыць наступнага выказвання В.Драгаўца пра тое, што "Народная газета" забівае клін паміж прэм'ерам і яго супрацоўнікамі, дык наўрад ці варта асабістыя перажыванні за сваё крэсла выносіць пры дапамозе Белінфарма на шматмільённую аўдыторыю. Я не дарадчык Вячаславу Францавічу Кебічу, хоць лічу, што практычная дзейнасць Упраўлення інфармацыі, якое навязвае ўсім газетам "сачыненні-выступленні" сваіх кіраўнікоў, сур'ёзна дыскрэдытуе выканаўчую галіну ўлады рэспублікі. Прэса Беларусі не для таго змагалася за дэмакратызацыю жыцця, за свабоду слова, за права чытачоў мець разнастайную, а не спушчаную "зверху" інфармацыю, каб сёння здацца на міласць тых, хто лічыць, што можна па старых камуністычных рэцэптах праводзіць палітыку бізуна і перніка. Хіба можна лічыць нармальным, калі начальнік Упраўлення задае на тым жа брыфінгу пытанне "з сэнсам": "Незразумела, чаму менавіта "Народная газета" павінна знаходзіцца ва ўрадавым будынку?" А чаму гэта вам, Васіль Мікалаевіч, незразумела, калі так вырашыў Прэзідыум Вярхоўнага Савета? І потым — што значыць "урадавы", "не ўрадавы"? Адкуль гэта імкненне гаварыць ад імя ўрада? Хто ўпаўнаважыў? Ды і колькі структур, якія не маюць ніякага дачынення да Саўміна, знаходзіцца зараз у Доме ўрада? Дарэчы, на мой званок па прычыне мяркуемага тэрміновага "высялення" рэдакцыі "Народнай газеты" выконваючы абавязкі прэм'ер-міністра М.Мясніковіч адказаў: "Мне нічога не вядома". Міхаіл Уладзіміравіч — законнік і ў адрозненне ад Васіля Мікалаевіча ведае, што пытанне аб месцы знаходжання органа Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь вырашаецца не шляхам інтрыг, а шляхам нармальных юрыдычных і законных працэдур.

Ад інтрыг недалёка і да падтасовак. В.Драгавец заяўляе, што ў мінулым годзе рэдакцыя "Народнай газеты" атрымала ў выглядзе датацыі 21 мільён рублёў, у той час як "Знамя юности" — 2,5 мільёна. Несумленны прыём выкарыстаў мой апанент. Па-першае, у агульную суму Васіль Мікалаевіч уключыў і тыя сродкі, якія запазычыла дзяржава за выпуск укладышаў Вярхоўнага Савета ў 1991 годзе і якія пагасіла толькі ў мінулым. Па-другое, ён "забыўся" сказаць, што з той жа казны рэдакцыя да гэтага часу не атрымала некалькі мільёнаў рублёў за выданне спецукладышаў у другім, трэцім і чацвёртым кварталах мінулага года. Па-трэцяе, ні слова не сказаў ён аб датацыях асноўным газетам, заснавальнікам якіх з'яўляецца Саўмін. Па-чацвёртае, амаральная сама спроба паказаць справу так, быццам датацыі рэспубліканскім газетам — гэта чыясьці персанальная міласць. Грошы плацяцца са сродкаў падаткаплацельшчыкаў, гэта сапраўды народныя грошы, а не грошы тых, хто прысвоіў сабе права лічыць, нібыта гэта ён "ашчаслівіў" тую або іншую газету. Па-пятае, пра якую "ашчасліўленасць" можна весці гаворку, калі за год (IV квартал 1991 — IV квартал 1992) рознічныя цэны за тавары і паслугі выраслі ў рэспубліцы ў 17 разоў, а грашовыя даходы насельніцтва — усяго ў 11 разоў. Каб падпісчык выклаў больш салідную суму за тую ж "Народную газету", трэба спаўна яму плаціць за працу. У адваротным выпадку, паўтараю, нельга падачкі ўрада выдаваць за нейкую "дабрачыннасць".

Вось яшчэ пра што хацелася б сказаць вам, Васіль Мікалаевіч. Хіба да гонару высокапастаўленага дзяржаўнага чыноўніка займацца тым, што, паводле вашых жа слоў, нясе ў сабе дэструктыўную арыентацыю чытачоў і грамадскасці. Зразумела, дзяржаўная датацыя ў "Народнай газеты" за 1992 год была вышэйшая, чым у "Знамени юности", але ж і тыраж у нас амаль у 5 разоў быў вышэйшы, чым у стаўшай "саўмінаўскай" калісьці незалежнай і папулярнай "Знаменки".

У растыражаванай справаздачы з брыфінгу сцвярджаецца, нібыта галоўны рэдактар "Народнай газеты" абвінаваціў Упраўленне інфармацыі Саўміна "ў арганізацыі праз Белінфарм публікацыі інтэрв'ю з Вячаславам Кебічам "Наш Пётр Міронавіч". Ці ж пра гэта гаворка? Хто супраць "арганізацыі" інтэрв'ю? Нават калі падначалены бярэ яго ў свайго непасрэднага начальніка. Няўжо, Васіль Мікалаевіч, вам не зразумела, што мяне як чалавека і галоўнага рэдактара абурыла не тое, што "кіраўнік урада выказаў свае адносіны да чалавека" (дзякаваць Богу, сёння кожны мае права выказваць свае думкі), і не тое, як пададзены вобраз Пятра Міронавіча ў інтэрв'ю (дарэчы, у тым, што гэта была моцная, неардынарная асоба, я сам меў магчымасць пераканацца), а тое, што ва "ўказалаўцы", перададзенай Белінфармам, утрымлівалася катэгарычнае, "пагрозлівае" патрабаванне — матэрыял абавязкова апублікаваць 12 лютага. Яно ў аднолькавай меры датычыць як газет, заснавальнікам якіх з'яўляецца Саўмін, так і тых, да якіх ён не мае ніякіх адносін. Праявілася туга па дырэктыўных часах? Захацелася безапеляцыйна ўказаць, каму, што і калі друкаваць? Рэанімацыя аддзела прапаганды ЦК КПБ, але пад шыльдай структуры Савета Міністраў? Вось гэтага якраз я як прафесіянальны журналіст, які шмат пабачыў і нямала нацярпеўся ад камуністычнай манаполіі на сродкі інфармацыі, ніяк не магу дапусціць. Згодны толькі ў адным: задача Белінфарма, як і іншых агенцтваў, — распаўсюджванне інфармацыі, матэрыялаў, у тым ліку і тых, якія датычаць вышэйшых службовых асоб рэспублікі. Распаўсюджванне, але не метадам прымусу. Розніца ёсць, і вялікая.

Менш за ўсё хацелася б, каб абмен кампліментамі паміж рэдакцыяй "Народнай газеты" і кіраўніцтвам Упраўлення інфармацыі Саўміна выглядаў як "міжсабойчык", якіх цяпер вялікае мноства паўсюдна. Пытанне больш прынцыповае. Напярэдадні ўскладнення палітычнай барацьбы, якая павінна даць адказ на пытанне аб выбары шляху, па якім пойдзе наша рэспубліка, зусім зразумела, што для грамадства недапушчальныя заангажыраванасць прэсы, яе манапалізацыя ў чыіх бы там ні было руках. Грамадскасць не павінна дапусціць, каб зноў запанаваў выпешчаны кімсьці прынцып "хто плаціць, той і заказвае музыку". Адкрытае імкненне некаторых структур узяць на сябе функцыі былога партыйнага агітпрапа можа стаць пятлёй на шыі дэмакратыі і прагрэсу. Усё больш выразна пачынае прасочвацца тэндэнцыя масіраванай атакі на любое публічнае выказванне, якое не супадае з пэўным "меркаваннем". Начальніку аддзела друку Саўміна тав. Паваляеву не спадабалася выступленне ў "Народнай газеце" старшыні Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі А.Дабравольскага. Рэакцыя адпаведная. Замест таго, каб выказаць сваё меркаванне, як прынята, на старонках таго органа друку, які змясціў першасны матэрыял, а гэта значыць у "Народнай газеце", тав. Паваляеў "распаўсюджвае" яго праз паслухмяныя "каналы" Белінфарма. У выніку чытачы многіх рэспубліканскіх газет вымушаны чытаць вяльможнае меркаванне і думаць самі сабе: а вось калі б я, просты грамадзянін, з чымсьці не пагадзіўся, дык маё пісьмо таксама растыражавалі б па ўсіх "каналах" або гэта чарговая прывілея "выбраных"? Так, чарговая прывілея. Але яна больш небяспечная для грамадскага арганізму, чым былыя спецпайкі і персанальныя пенсіі. Манапольнае права на інфармацыю, якое стараецца ўхапіць Упраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязей Савета Міністраў, небяспечнае ўсталяваннем новай духоўнай дыктатуры. Мы ўжо зведалі і Суслава, і Паўлава, і Сакалова. Дзякуем, сытыя па горла.

Іосіф СЯРЭДЗІЧ,
галоўны рэдактар "Народнай газеты",
народны дэпутат Рэспублікі Беларусь.

Ад рэдакцыі.

Каб чытачы "Народнай газеты" мелі магчымасць зрабіць аб'ектыўныя вывады, мы ўсё ж вырашылі даслоўна працытаваць тое месца справаздачы з брыфінгу, у якім ідзе гаворка пра артыкул галоўнага рэдактара "Народнай газеты":

"... Размова на брыфінгу з чыста "матэрыяльнай" сферы нечакана пераключылася ў духоўную. Прычынай для гэтага паслужылі нядаўнія публікацыі ў "Народнай газеце" і ў "Праўдзе".

(Заканчэнне на 3-й стар.)

Дзесятая сесія прайшла канструктыўна

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

І яшчэ адзін немалаважны момант. Пры прыняцці закона аб прыватызацыі дэпутаты праявілі разумную стрыманасць, не стаўшы на шлях абвальнай прыватызацыі. Штогод Вярхоўны Савет па прадстаўленню Савета Міністраў будзе вызначаць задачы, мэты і тэрміны этапаў прыватызацыі, зацвярджаць прыярытэты і абмежаванні. Так што працэс прыватызацыі будзе насіць кіруемы характар.

❑

Пры ацэнцы вынікаў сесіі апазіцыя адным са "смяротных грахоў" большасці ў парламенце называе перанос на наступную сесію прыняцця закона аб уласнасці на зямлю. Бясспрэчна, гэта важнае пытанне ў жыцці рэспублікі, але я не стаў бы драматызаваць сітуацыю. Адсутнасць гэтага закона не перашкаджае рыначным пераўтварэнням на сяле. Дзеючыя ў рэспубліцы заканадаўчыя акты дазваляюць выдзяляць жадаючым зямлю для вядзення фермерскай гаспадаркі ў пажыццёвае спадчыннае валоданне, для калектыўных садоў і агародаў, пад індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва.

У той жа час змяненне канцэпцыі закона з выключэннем калектыўнай формы ўласнасці на зямлю не азначае ліквідацыю калектыўнай формы арганізацыі працы на зямлі. За гэтым крокам не крыецца пагроза прымусовай дэкалектывізацыі. Новая канцэпцыя закона прадугледжвае, што калгасы, саўгасы і фермеры атрымаюць зямлю ад дзяржавы ў доўгатэрміновую арэнду, а ў прыватную ўласнасць будуць перададзены зямельныя ўчасткі для вядзення падсобнай гаспадаркі, для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, садаводства і дачнага будаўніцтва. Вопыт нашых суседзяў пераканаўча сведчыць, што любыя дзеянні па фарсіраванаму змяненню склаўшыхся форм гаспадарання на зямлі немінуча правакуюць харчовы крызіс, вядуць да абвастрэння сацыяльнага становішча на сяле. Думаю, ні адзін са змагароў за неадкладнае змяненне форм уласнасці на зямлю не згодзіцца заплаціць такую цану за рэалізацыю гэтых ідэй у жыцці.

Тыя з чытачоў, хто рэгулярна сочыць за дзейнасцю Вярхоўнага Савета, ведаюць, што работа над законам аб зямлі мае працяглую гісторыю. Вакол гэтай праблемы вяліся гарачыя дэбаты на папярэдняй 9-й сесіі, калі на разгляд Вярхоўнага Савета былі вынесены праект Савета Міністраў і альтэрнатыўны праект апазіцыі. Наша аграрная камісія і большасць парламента падтрымалі першы з іх, у якім прадугледжваліся тры формы ўласнасці на зямлю, у тым ліку калектыўная, якая, уласна, і з'явілася каменем спатыкнення ў спрэчках. І тут разумення заслугоўваюць абодва апаніруючыя бакі. Не гэтак проста памяняць сваё псіхалагічнае ўспрыманне дадзенай праблемы, пераступіць праз стэрэатып, які складваўся гадамі вытворчых адносін на сяле. Можна зразумець пазіцыю аграрнікаў, якія ў юрыдычным замацаванні інстытута калектыўнай уласнасці на зямлю бачаць гарантыю далейшага існавання калгасаў і саўгасаў, а значыць, і свайго, няхай невысокага, але гарантаванага ўзроўню жыцця.

Аднак вывучэнне ходу зямельнай рэформы ў суседніх дзяржавах, сусветная практыка дэманструюць, што галоўнае ў дасягненні высокаэфектыўнай вытворчасці ў сельскай гаспадарцы заключана не ў форме ўласнасці на зямлю. Вызначальным з'яўляецца магчымасць вытворцы распараджацца вынікамі сваёй працы. Працэс жа распачатага дзялення калектыўнай уласнасці на долі і паі ні ў якой ступені не садзейнічае стабільнаму існаванню калектыўных гаспадарак. Усё гэта і падштурхнула ўрад і Прэзідыум Вярхоўнага Савета да перагляду канцэпцыі закона і замацавання ў ім толькі дзяржаўнай і прыватнай форм уласнасці.

❑

Вельмі няпроста ішло абмеркаванне на сесіі праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Відаць, па-іншаму не магло і быць. Наша рэспубліка знаходзіцца цяпер на пераходным этапе свайго развіцця, калі працэс станаўлення цывільнага грамадства толькі пачаўся. Фактычна асобным сацыяльным групам насельніцтва яшчэ толькі належыць усвядоміць і ясна выявіць свае доўгачасовыя інтарэсы, выпрацаваць стратэгічную і тактычную лініі іх дасягнення. Менавіта таму пры разглядзе праекта Канстытуцыі спектр выказванняў дэпутатаў аказаўся вельмі шырокім і часта яны насілі палярны характар. І ўсё ж, памятаючы дадзенае выбаршчыкам абяцанне аб паскарэнні канстытуцыйных пераўтварэнняў, у ходзе шматдзённых дэбатаў заканадаўцы здолелі дасягнуць пэўнага збліжэння пазіцый і вызначыць асноўныя палажэнні, якія павінны быць замацаваны ў Асноўным Законе. Большасць дэпутатаў выказалася за тое, што Беларусь павінна стаць прэзідэнцкай рэспублікай, дзе прэзідэнт — кіраўнік выканаўчай улады; за магчымасць сумяшчэння ў Вярхоўным Савеце дэпутацкіх паўнамоцтваў з вытворчай і службовай дзейнасцю. Акрамя гэтага, канстытуцыйна павінны быць замацаваны такія важныя і прывычныя для нас палажэнні, як даступнасць бясплатнага медыцынскага абслугоўвання і атрыманне бясплатнай адукацыі ў дзяржаўных навучальных установах, а таксама агульнасусветная практыка дзяржаўных гарантый грамадзянам роўных правоў у ажыццяўленні гаспадарчай дзейнасці, стварэнне аднолькавых умоў для развіцця ўсіх форм уласнасці.

Канстытуцыйную камісію, ды і ўсіх заканадаўцаў, чакае складаная і адказная работа па дапрацоўцы і прыняццю новай Канстытуцыі.

❑

У чалавека, які фарміруе сваю думку аб рабоце парламента па кароткіх газетных і тэлевізійных рэпартажах, можа скласціся ўражанне, што на цяперашняй сесіі "працэс не пайшоў", што за фракцыйнай барацьбой, асабліва ля мікрафонаў, дэпутаты забыліся пра патрэбы сваіх выбаршчыкаў. Гэта, вядома, не так. Сесія прыняла дзесяткі прававых актаў, якія абараняюць у гэты пераходны перыяд інтарэсы большасці насельніцтва. Сярод важнейшых з іх — законы аб дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, аб ахове навакольнага асяроддзя, законапраекты аб ахове здароўя грамадзян, аб экалагічнай экспертызе, пастановы аб памеры мінімальнай заработнай платы, аб індэксацыі ўкладаў насельніцтва, аб кампенсацыях ахвярам палітычных рэпрэсій і іншыя.

Разумеючы ўзрастаючую занепакоенасць грамадства ростам злачыннасці ў рэспубліцы, Вярхоўны Савет прааналізаваў работу праваахоўных органаў — пракуратуры, МУС і КДБ. Прычын неэфектыўнай работы органаў правапарадку шмат: нізкая тэхнічная аснашчанасць, няўзгодненасць у дзеяннях, недасканаласць прававой базы. Думаецца, што прынятыя сесіяй заканадаўчыя акты аб Пракуратуры Рэспублікі Беларусь, аб аператыўна-вышуковай рабоце, аб узмацненні барацьбы з карупцыяй і некаторыя іншыя дазволяць зрабіць больш жорсткай барацьбу са злачыннасцю, разрадзіць крыміногенную сітуацыю ў рэспубліцы.

Шмат увагі ўдзялілі дэпутаты вялікаму блоку так званых ваенных законаў, якія рэгламентуюць ролю і месца арміі ў нашай дзяржаве. Ваенная дактрына, зацверджаная Вярхоўным Саветам, вызначыла, што Рэспубліка Беларусь не разглядае ні адну дзяржаву ў якасці патэнцыяльнага праціўніка, ні да аднаго народа не адносіцца як да свайго ворага, прытрымліваецца прынцыпу непарушнасці граніц, з усімі будуе адносіны на аснове роўнасці і захавання ўзаемных інтарэсаў. Хаця дакумент і мае грозную назву "ваенная дактрына", але гэта дактрына міралюбівай дзяржавы, якая вызначае колькасць арміі і структуру яе ўзбраенняў, заснаваную на прынцыпе абароннай дастатковасці. Асабліва адзначу ў гэтай сувязі ратыфікацыю Вярхоўным Саветам у поўным аб'ёме без агаворак і якіх-небудзь папярэдніх умоў дагавораў аб скарачэнні і абмежаванні стратэгічных наступальных узбраенняў (СНУ-1) і аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі. Беларусь тым самым яшчэ раз прадэманстравала вернасць выбранаму курсу на нейтралітэт і бяз'ядзернасць.

Усім гэтым падзеям папярэднічала вялікая падрыхтоўчая работа дэпутатаў, ваенных спецыялістаў і вучоных у Савеце бяспекі, Кансультатыўным савеце, у пастаянных камісіях Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Лагічным завяршэннем фарміравання прававой базы Ўзброеных сіл з'явілася прывядзенне ў канцы 1992 года асабовага складу арміі да прысягі на вернасць народу і Рэспубліцы Беларусь.

❑

Падводзячы вынікі сесіі, якая завяршылася, з пэўнасцю магу сказаць, што яна ў цэлым прайшла канструктыўна і насіла, безумоўна, рэзультатыўны характар. Вярхоўны Савет адэкватна рэагаваў на сітуацыю, якая складваецца ў рэспубліцы і за яе межамі. Як і раней, парламент здолеў адсячы крайнія пункты погляду, ідучы па шляху прыняцця ўзважаных, збалансаваных рашэнняў, зразумелых большасці грамадства. Прынятыя рашэнні і законапраекты знаходзяцца ў рэчышчы стратэгічнай лініі на пабудову дэмакратычнай прававой дзяржавы з сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікай, садзейнічаюць напаўненню рэальным зместам суверэнітэту рэспублікі.

Ад сесіі да сесіі набываецца пазітыўны вопыт парламенцкай дзейнасці нашага дэпутацкага корпусу. Яўна інтэнсіфікаваўся працэс заканатворчай работы. У ходзе сесіі шэраг законапраектаў прайшлі першае і другое чытанне і набылі сілу законаў.

Дзесятая сесія завершана, але заканатворчая дзейнасць парламента на гэтым не спыняецца. Ужо распрацаваны план работы Вярхоўнага Савета і яго Прэзідыума на бягучы год. На 23 сакавіка назначана нечарговая, а на 18 мая чарговая сесія. Пошук вырашэння праблем, якія стаяць перад нашай рэспублікай, працягваецца.

Из почты журналиста

Ежедневно в адрес "Народной газеты" приходят сотни писем от наших читателей. Есть среди них и особые, те, которых с нетерпением ждут журналисты. Это читательские отклики на их выступления. У каждого обозревателя газеты бережно хранятся папки с этими письмами, в которых содержатся и поддержка автора, а порой и резкое неприятие его позиции, неравнодушные советы. Жаль, что это настоящее богатство так иногда и остается в личном архиве журналиста.

Мы решили, что новая рубрика "Из почты журналиста" найдет свое место в газете и не останется не замеченной читателями.

Итак, сегодня премьера рубрики.

Народ должен прозреть!

Уважаемый Павел Якубович! Большое спасибо вам за статью (и не только за эту) "Мы рождены, чтоб Кафку сделать былью?". Может быть, благодаря таким статьям всевозможные "борцы за дело трудящихся", а на самом деле рвачи, демагоги и трутни будут знать свое место. Хотя, по правде, "место" у них сейчас, как и раньше, "руководящее".

Но ведь должен же народ прозреть, увидеть, кто им руководит.

Спасибо за правду.

М.ЛЕНКОВЕЦ.

г.Ганцевичи.

Чью волю вы выполняете?

...Статьей П.Якубовича полностью раскрыта суть и направленность вашей газеты. Напрасно вы назвали ее "Народной", голос народа вами не услышан. Если вы решили таким образом и руководителей Советов разгонять, а затем и сами Советы, то понятно, чью волю вы выполняете. Извините, но трудно поверить, что государственная газета в демократической Беларуси такова, как речь господина П.Якубовича!

По поручению группы депутатов
(подпись неразборчива).

Председатель зовет на баррикады. А город превращается в свалку

Разрешите поблагодарить вас за статью "Мы рождены, чтоб Кафку сделать былью?". Обращения товарища Замулко в стиле "новогоднего" и раньше печатались. К 7 ноября — в "Камунісце Палесся", а после путча — в "Жыцці Палесся". То же нагнетание неуверенности, страха у людей, вопли в духе призывов вчерашней "руководящей и направляющей".

Я обращался с рассуждениями, подобно вашим, с открытым письмом в газету "Жыццё Палесся". Мое "открытое письмо", конечно, напечатано не было, хотя "открытый ответ" на первой странице газеты я получил в типичном застойно-коммунистическом стиле, когда отдельно взятые фразы из моего письма редактором газеты Черной Л.П. "обгладывались" с разных сторон.

Интересно, какого ответа удостоится ваша статья? Я уверен, что "вчерашние" и "сегодняшние призраки" не оставят своего вожака и выскажут свое "гневное возмущение" в адрес вашей личности. Насколько мне известно, состоялась даже сессия горсовета по этому поводу. На что уходит энергия наших избранников?

Казалось бы, мешает ли развал империи и Беловежское соглашение решению многих городских проблем? К примеру, таких будничных, как обеспечение городских служб контейнерами для сбора мусора? Их отсутствие не только отвлекает тысячи людей от домашних забот в ожидании мусоровоза, но и превращает достопримечательности нашего города — овраги — в мусорные свалки. И это в зоне периодического контроля!

Неужели, чтоб изготовить на предприятиях города эти контейнеры, нужно, как патетически призывает Замулко, "объединить усилия русских, украинцев, белорусов"? Нет, надо просто уметь работать, уметь организовать людей. Но у "борцов" на это не хватает умения. Вот пугать, стращать — это они умеют! Что мешает выполнить решение сессии горсовета о выделении семи многодетным семьям благоустроенных квартир? Проще предложить вместо 18 $м^2$ барака — 24 или 36 $м^2$ "хрущевки". На 8 человек! Заранее провоцируя их отказаться. Да один переезд равносилен двум пожарам! А сколько других возможностей у горисполкома для того, чтобы показать, что есть у города умелый хозяин! Больницы, магазины, детсады... Но горсовет увлечен борьбой за "авторитет" своего главы. Знают, за что борются...

В.ТЕЛЕПУН.

г.Мозырь.

Наших бьют!

Получил номер "Жыцця Палесся", где опубликован "отлуп" некоторых депутатов по поводу статьи в "Народной газете". Посмотрел на подписи тех, кто ринулся на защиту Замулко. Ну, конечно... Г.Зайцева (бывшая зав. отделом пропаганды горкома КПБ), А.Зборовский (бывший второй секретарь Мозырского горкома партии), Г.Кудинов (бывший заместитель секретаря парткома треста N 6 "Мозырьнефтехимстрой"), Н.Цедрик (бывший секретарь парткома "Мозырькабеля"). Дальше и читать не стал. Ну разве такие люди позволят, чтобы кто-то сказал слово против их бывшего партийного вожака? Это же все равно что против них самих. Рядясь в тогу "защитников" народа, эти начальники борются не за народ, а за свои кресла. Долго ждали они своего часа. Кажется, дождались. А тут вы со своей критикой! А правдивое слово для них — что нож острый. И от своей беспрестанной грызни и внутрипартийных интриг они сразу же переходят к атаке. Наших бьют! И ради этого "единства", ради объединяющей идеи — руководить при всех режимах и политических доктринах — они никого не пощадят. Это вам не демократы. Это люди серьезные, с опытом.

И.КОВАЛЕНКО.

г.Мозырь.

Кто кипит "праведным гневом"?

Уважаемый товарищ!

К вам обращается старый член КПСС, участник Отечественной войны, бывший разведчик.

Сегодня прочитал в нашей городской газете в "официальном отделе" попытку защитить и оправдать нашего председателя исполкома Замулко. Возмущен крайне этой наглой выходкой "защитников" и решил тотчас написать вам мое к этому отношение. Думаю, таких будет очень много.

Нет слов, ваша статья "Мы родились, чтоб Кафку сделать былью?" очень справедлива и отвечает на вопросы: почему у нас перестройка идет крайне тяжело и мучительно? Ей мешают такие "деятели", которые ловко пересели из кресла в кресло и опять правят... Этому не будет конца...

Стоит только посмотреть на подписи тех, кто вас "осуждает" и вообще кипит "праведным гневом". Все — знакомые лица! Это не просто "однодумцы" — это целая каста людей, прилипших десятилетиями к своим кабинетам и креслам, отвыкших по-человечески работать, но любящих жирно есть, мягко спать, бесплатно каждый год лечиться, получать конвертики с помощью, держать под контролем все продуктовые и промтоварные базы. Социалистические князья! Они до смерти будут стоять за эти права, и их так легко не вышибить. Это вам не помещики и капиталисты в 1917 году. Это особая каста людей, и свои связи они берегут и надежно укрепляют.

Поняв, откуда ветер дует, они в свое время разбежались из горкомов по теплым местам, а сейчас изнутри мешают перестройке, компрометируют ее.

У нас в городе предприятия, торговля, служба быта продаются по частям (и это за спасибо), а профессиональные начальники и их близкие, несмотря на то, что имеют квартиры, выстроили себе коттеджи, которые и не снились дворянам. Приезжайте, посмотрите, что они делают! И управы на них нет. Вот отчего народ ропщет, вот чем мы недовольны.

Простите, что так нервно и сумбурно пишу. Не ставьте мою подпись, потому что стар уже бороться и боюсь их крепких еще кулаков, а защиты у меня нет, кроме моей совести.

А.К.

(Адрес и фамилия в редакции есть.)

Если будет суд — берите меня в свидетели

Я подписчик "Народной газеты". Выписываю ее со дня основания. Многим советую ее выписывать.

Дорогой Павел! Очень большое спасибо, что вы проявили мужество, выполняя свой гражданский, журналистский и профессиональный долг, и разоблачили в этой статье мозырских горе-руководителей...

Они клянутся в верности демократии, народу, но делают свое черное дело. Они саботируют законы, которые принимаются Верховным Советом Беларуси.

У честных, порядочных людей звучат одобрения вашей статьи. Но я и другие демократы вас предупреждаем. Будьте бдительны и настойчивы. Они (И.Замулко и его компания) поведут против вас контрнаступление, бешеную атаку в клевете. Уже на сессии народных депутатов хвастают, что Якубовичу не быть, не работать в "Народной газете".

В моем доме живет депутат Мозырского горсовета народных депутатов Гнедько Александр Федорович. Когда я получил газету, обратился к нему. Он прочитал ее, одобрил. Я его просил, чтобы он со своими единомышленниками (а мой депутат придерживается демократических принципов) поставил вопрос на сессии о доверии И.Замулко.

Он взял газету, а на следующий день 20 января состоялась сессия горсовета. По его словам, словам моего депутата, первым был поставлен вопрос "о клеветнической статье" в "Народной газете". Начался шум, гам. Мол, оскорблен председатель, оскорблены все депутаты. Подавляющим большинством голосов была принята резолюция, осуждающая вашу статью. Говорят некоторые депутаты, что если бы вы там были, то вас бы растерзали. А жизнь между тем становится все тяжелее. Этого никак не могут уяснить себе фанатики-коммунисты. Нет у них совести, честности, чтобы покаяться перед народом за грехи "руководящей и направляющей". Спросите корреспондента "Известий" от Беларуси Матусковского, который баллотировался в Верховный Совет по Мозырю. Его оппонентом был секретарь обкома КПБ. По указанию горкома партии Матусковского "затупывали", свет гасили, все его портреты срывали участковые милиционеры. Сам видел.

Прошу мое письмо написать под псевдонимом. Уничтожат меня, сожгут дом, гараж, как жгут фермеров. Но если они будут судиться с вами, то возьмите меня в свидетели. Я расскажу суду всю правду об этих "народных слугах".

Иван МОНЕТО,
ветеран ВОВ и партизанского движения, инвалид ВОВ II группы.
(Подлинная фамилия и адрес в редакции есть.)

Выбранные места из переписки с друзьями

Так для чего мы все-таки рождены?

Очевидно, надо напомнить читателям суть. В материале "Мы рождены, чтоб Кафку сделать былью?" я попытался поразмышлять о странной особенности нашего бытия, о том, что живем мы как бы по сценарию, написанному для театра абсурда, о том, что вместо мудрых государственных мужей нами, аккуратно сменяя друг друга, руководят люди, многим из которых вообще-то противопоказана такая деятельность. Но, как братец Иванушка, этот проворный люд ударяется в звании секретаря горкома партии о землю и тут же из злой аппаратной Кикиморы немедленно превращается в красавца Леля вполне демократического склада. При этом даже не поменяв служебного кабинета. Конечно, может быть, кое-кому подобное общественное коловращение и нравится, но у меня оно вызывает зевоту. Неужели наша обильная земля, неужели наш народ не могут выдвинуть из своих недр и пластов кого-нибудь нормального и порядочного и все так же из года в год будет тасоваться унылая номенклатура вчерашних секретарей, всяких замзавов и завсекторами? Безусловно, есть среди них люди по-своему замечательные, прекрасные товарищи и хорошие семьянины, знатные охотники и рыболовы, а иногда и толковые специалисты-администраторы. Но в большинстве своем это все же, как ни печально, люди вчерашнего дня. Пройдя фельдфебельскую выучку в своих "аппаратах", они овладели одной добродетелью — демократическим централизмом. Это значит: чти начальство, дави всех прочих и не рассуждай! Ну как с таким теоретическим багажом они могут двигаться вперед и двигать к благополучию вверенные им массы? Кроме администрирования, они мало что умеют... Годы так называемой перестройки объективно показали, на что способны эти "испытанные" кадры. Цены, от которых глаза лезут на лоб, дефицит простейших товаров и необходимых продуктов, разруха в цехах и на фермах, преступность. Это что, "заслуга" так называемых демократов? Да покажите мне их хотя бы полдюжины из ста наших руководителей районов и областей, не говоря уже о деятелях более низкого "звена"! Кто из председателей исполкомов пришел за свои двойные дерматиновые двери с митинговых площадей, а не из ЦК КПБ или обкомов, райкомов компартии? Кто из них не имеет в своей биографии "ответственной" партийной работы? Так кто довел нас до плачевных итогов? Позняк, у которого из всех атрибутов власти есть лишь зычный голос да еще шариковая авторучка? Лугин, Ходыко, Науменко, Борщевский, Сидоревич, Семдянова? Да вы, возможно, о некоторых из них и не слышали, поскольку эти лидеры демократического движения ровным счетом ничего не решают и ни на что в организационном смысле не оказывают влияния. Разумеется, это сказано не в укор им, а является простой констатацией фактов — сегодня, в феврале, на ключевых постах промышленности, сельского хозяйства, торговли, просвещения и здравоохранения, общепита и т.д. и т.п. находятся те же самые люди, которые исполняли эти же самые функции и раньше. Из данного пассажа, конечно же, не вытекает, что все они никудышные работники и плохие специалисты. Отнюдь! Но факт остается фактом. Если верить великому "кормчему", что "кадры решают все", то "кадрам", которые сегодня, не брезгуя средствами, пытаются спихнуть бедственное положение народа на неких злонамеренных "демократов", лучше помолчать...

Чтобы проиллюстрировать эту достаточно ясную мысль, я обратился к случайно подвернувшейся мне заметке председателя Мозырского горисполкома И.Замулко, с которой он выступил в виде "обращения к горожанам" в новогоднем номере газеты "Жыццё Палесся". Мне показалось, что в этих ста строчках И.Замулко как бы сконцентрированы все аспекты нашего родного абсурдизма.

Вы можете себе представить, чтобы на свадьбе среди разодетых гостей появился оригинал с фиговым листком вместо костюма-тройки? Вряд ли, ибо это противоречит принятым обычаям. А как бы назвали этого чудака?

Далее. Существует добрый обычай поздравления с Новым годом. Как бы вы охарактеризовали человека, который вместо добрых пожеланий и иных хороших слов прислал бы вам письмо, где стал бы страшно пугать и всячески портить настроение? А ведь именно так — страшно и неуклюже — выглядит "обращение" председателя Мозырского горисполкома к читателям.

Но, разумеется, вряд ли стоило даже из-за этих проявлений высокого ума и такта писать статью. Дело в том, что в "поздравлении" И.Замулко я увидел реальное воплощение в жизнь новой тенденции — стремление навязать окружающим свое понимание пути, по которому обязана идти республика, желание повернуть вспять только-только нарождающиеся общественные и экономические процессы, ввести в обиход старую терминологию и старые методы. Здесь и сваливание с больной головы на здоровую, поиск каких-то мифических врагов, которые хотят "закабалить" мозырян, ностальгическая тоска по интернациональному прошлому, совмещенная с боевым призывом... объединяться по национальному признаку. Против кого? Вот эта сплошная эклектика, в которой, кажется, мало места для здравого смысла, и показалась мне достойной осуждения. Актуальность разговора вызвана еще и тем, что сегодня вновь организационно оформляются структуры коммунистической партии. Несмотря на красивую риторику, что это будет партия "нового типа", в печати фигурируют лица, хорошо известные по своей многолетней кипучей и довольно-таки тусклой деятельности. Кстати, и товарищ Замулко среди "первых лиц" в партийном комитете своей области. Это вполне вероятно значит, что гомельские трудящиеся обретут в вожди человека, который последние двадцать лет только тем и занимается, что руководит и обещает, обещает и руководит. Какой из этого толк? Прочитайте некоторые письма, пришедшие в качестве откликов на мою статью. Со мной спорить легко, пусть лучше И.Замулко поспорит с ними, с мозырянами. Пусть и его "защитники" убедятся в градусе "всенародной любви" населения. Глас народа — глас Божий, не так ли?

Кстати, у "почты", пришедшей из Мозыря, есть одна особенность. Люди, критикующие деятельность И.Замулко, в большинстве случаев просят, чтобы их письма были подписаны псевдонимом. Это также "итог" нашей "демократизации" и "построения правового государства" — люди по-прежнему, как и в 1938 году, боятся начальства и предпочитают помалкивать. Те письма, где меня от имени, скажем, "рабочего автоколонны" кроют матом и сообщают, что "И.Замулку мы вам не отдадим" (ах, какое было бы замечательное приобретение!), подписаны людьми, а их, как я выяснил... не существует в природе. Мне это напомнило славные времена, когда профессиональные политбойцы любили действовать от имени "простых рабочих и колхозников". Кто действительно с открытым забралом решил защитить своего лидера — так это коллеги И.Замулко по горсовету. Я с большим вниманием и уважением прочитал их "обращения" и "открытое письмо", опубликованные в газете "Мы и время". Сожалею, что вызвал у этих занятых людей такие бурные эмоции, не ожидал. Скромно надеюсь, это не помешает им сосредоточить свои усилия на искоренении недостатков, о которых сообщают "Народной газете" их избиратели. Хотя я понимаю, что навести порядок в городском хозяйстве, коммунальных службах, торговле, здравоохранении гораздо труднее, чем обличить журналиста в том, что им движут какие-то "разрушительные" намерения. Но от этого жизнь в Мозыре, увы, не улучшится...

Откликнулась на мою статью и "Гомельская праўда", причем одновременно литературным критиком и пламенным адвокатом выступил сам главный редактор Валерий Логвин. Его темперамент, чистота помыслов, героическая готовность первым выбежать на разминированное поле, воскрешают в памяти старую песню: "Если ранили друга, сумеет подруга..." Поэтичная натура! Но если перейти к прозе, то суетливая готовность В.Логвина немедленно выступить на защиту "начальства" говорит о том, что среди моих коллег по-прежнему популярен следующий тип: симбиоз служителя второй древнейшей профессии и вышколенного многолетней службой в "партийной печати" лакея, только и жаждущего от "старших товарищей" команды: "Фас!" Эх, верные Русланы от журналистики... Неужто будете всю жизнь высасывать "темы" из указательных пальцев?

Впрочем, это мелочи. Главное в другом: неужели нам ничего не светит хорошего? Так и будем существовать от нового Сталина до нового Хрущева, потом при развитом социализме, потом будем пить, потом бороться с пьянством, потом разгонять райкомы и создавать их вновь? А жить-то когда?

Павел ЯКУБОВИЧ.

Набалелае

... Не забывайце і пра жывых

У "Народнай газеце" за 15 студзеня прачытала пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь "Аб увекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў". І ведаеце, неяк стала не па сабе: да чаго ж толькі не дадумаюцца ў нашым урадзе? Напрыклад, у пастанове запісана:

"Стварыць дзеля гэтага ў камітэце ўпраўленне з 9 чалавек".

"Да 1 лютага даць прапанову аб увекавечанні..."

"Да 1 красавіка стварыць спецыяльныя вайсковыя фарміраванні..."

"У двухмесячны тэрмін разгледзець пытанне аб стварэнні аргструктур" і г.д.

Прачытала я гэтыя радкі і падумала: наколькі прасцей весці справу аб увекавечанні загінуўшых ці памёршых, чым дапамагаць яшчэ жывым абаронцам Радзімы.

Я хачу сказаць пра свайго бацьку, які жыве ў в.Русаковічы Пухавіцкага раёна, Шэлега Канстанціна Яўсеевіча. Яшчэ тры гады назад, у лістападзе 1989 года, ён стаў у чаргу на пакупку халадзільніка і тэлевізара. Ды так і не дайшла да яго чарга. А цяпер, сказалі, ніякіх ільгот для інвалідаў няма і купляйце як зможаце.

У сакавіку 1992 года папрасіў бацька выпісаць яму дроў у Пухавіцкім гарпаліве. Яму паабяцалі прывезці спачатку ў маі, потым у ліпені, потым да новага года... Апошні тэрмін быў прызначаны на 10 студзеня, ды сказалі, што няма дроў у гарпаліве. І да гэтага часу яны не прывезены. А мой бацька і абаронца, і інвалід вайны I групы, і пацярпеўшы ад рэпрэсій 30-х гадоў.

Сумна ад таго, што ў нашай краіне ўсё робіцца больш на паперы, чым на самой справе. І на падставе выказанага думаю, што гэта пастанова — чарговы цынізм у адносінах да яшчэ жывых абаронцаў Радзімы.

Уся пастанова нібы кажа яшчэ жывым: "Вось памірайце хутчэй і аб вас паклапоцімся". А калі цяпер яшчэ жывыя абаронцы просяць дапамогі, то ніхто на іх просьбы не звяртае ўвагі.

Праўда, і грошай дабавілі, і прыходзяць часам даведацца, і прынясуць хлеба. За гэта вялікі дзякуй, але ж патрэбны дровы, а ўлетку патрэбен халадзільнік.

Даруйце, калі рэзка выказалася, але інакш не атрымліваецца. Не, пра загінуўшых трэба памятаць, але нельга забываць і жывых. І клопаты неабходна праяўляць не на словах, а на справе.

З пашанай да "Народнай газеты"

Надзея ШЭЛЕГ.

г.Мінск.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У прыватнасці, рэдактар "НГ" Іосіф Сярэдзіч у сваім артыкуле "Не магу маўчаць!" абвінавачвае Упраўленне інфармацыі Саўміна ў арганізацыі праз Белінфарм публікацыі інтэрв'ю з Вячаславам Кебічам "Наш Пётр Міронавіч". На думку аўтара, прэм'ер-міністру тым самым аказана "мядзведжая паслуга".

Начальнік Упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязей Васіль Драгавец паведаміў, што юбілей Машэрава быў цёпла адзначаны ў рэспубліцы. Кіраўнік урада выказаў свае адносіны да чалавека, якога добра ведаў і вобраз якога шчыра абвядзецца тых, хто сапраўды мае намер будаваць і ўпарадкоўваць нашу Беларусь. Іншая справа, што трактоўка асобы Пятра Міронавіча рознымі людзьмі ўспрымаецца па-рознаму. Калі зыходзіць з "логікі" Іосіфа Сярэдзіча, што за службай Белінфарма аб публікацыі інтэрв'ю "тырчаць вушы" Саўміна, то такое ж "рэзюме" можна зрабіць і адносна іншых матэрыялаў, перададзеных інфармацыйным агенцтвам. У прыватнасці, у тым жа нумары "НГ", у іншых газетах апублікавана выступленне Станіслава Шушкевіча на рэспубліканскай нарадзе па пытаннях законнасці і правапарадку, таксама распаўсюджанае Белінфармам. Аднак такія "вывады", лічыць кіраўнік урадавай інфармацыйнай службы, не могуць разглядацца як сур'ёзныя аргументы і нясуць у сабе дэструктыўную накіраванасць і тычачоў, і грамадскасці. Тым больш, падкрэсліў Васіль Драгавец, Белінфарм традыцыйна — і гэта адна з яго задач — займаецца распаўсюджваннем выступленняў і матэрыялаў, якія датычаць вышэйшых службовых асоб дзяржавы, і выпадак з юбілеем П.Машэрава не быў выключэннем.

На думку Васіля Драгаўца, у матэрыяле дастаткова ясна робіцца спроба дэзарганізаваць работу Савета Міністраў і "забіць клін" паміж прэм'ерам і яго супрацоўнікамі. Пэўны адказ на пытанне: чаму гэта зроблена? — змяшчаецца ў самім матэрыяле. Размова ідзе пра пераезд рэдакцыі "НГ" у новы корпус Дома друку, дзе ўжо справіла наваселле рэдакцыя газеты "Рэспубліка" і куды збіраюцца перавесці рэдакцыі іншых рэспубліканскіх газет. Прапанова ўрада, які таксама адчувае недахоп плошчаў, каб супрацоўнікі "Народнай газеты" таксама працавалі ў спецыяльна абсталяваным будынку, ніколькі не ўшчамляе інтарэсаў калектыва. Незразумела, чаму менавіта "НГ" павінна знаходзіцца ва ўрадавым будынку?

Абвергнуў Васіль Драгавец і паведамленне "Народнай газеты" ад 17 лютага аб тым, што яна атрымлівае найменшыя датацыі ад Саўміна. Па-першае, што "НГ" фінансуецца з бюджэту, у тым ліку і валютай, пачынаючы з 1990 года. Што ж датычыць лічбаў, то ў мінулым годзе рэдакцыя атрымала 21 мільён рублёў, у той час як "Знамя юности", напрыклад, 2,5 мільёна".

Памяць

А ў Яўгена быў бы дзень нараджэння...

Валеры ДРАЗДОЎ

У будынку беларускай гімназіі N2 горада Барысава грымеў бой. Кулямётную траскатню глушылі выбухі снарадаў, несліся ў эфір трывожныя прызывы радыста, выклікаючага на падмогу баявыя верталёты...

Бой быў, канешне, не сапраўдны. Дыярама, створаная выкладчыкам мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педінстытута Ігарам Гарбуновым, напомніла большасці прысутных пра іх баявое юнацтва і яшчэ пра іх неадплатны боль. Боль у сэрцы за тых, хто аддаў сваё жыццё ў гарах пад Кандагарам ці Кабулам.

Памяці іх прысвечаны музей воінаў-інтэрнацыяналістаў, адкрыты ў Барысаве. Чырвоную стужку было даручана перарэзаць родным загінуўшых. Яны ж першымі пераступілі парог музея.

Бліснулі слёзы на вачах у маці. Менавіта сёння ў Яўгена Хмелінко быў бы дзень нараджэння. Але 17 красавіка 1980 года жыццё беларускага хлопца абарвала душманская куля. Яўген быў першым з барысаўчан, цела якога на Радзіму з далёкага Афгана прывёз так званы "чорны цюльпан".

Ён так і застаўся ў памяці землякоў дзевятнаццацігадовым. Менавіта такім, як на здымку: просты хлопец, па модзе таго часу з доўгімі, да плеч, валасамі. Ён нават не паспеў зняцца ў вайсковай форме. Як і яго землякі, Генадзь Серафімовіч, які загінуў у першы дзень 1986 года, Валеры Ус. Навекі застанецца ў нашай памяці медсястра Галіна Страљчонак. 22 барысаўчаніны загінулі ў Афганістане. Але іх тут не забудуць.

Не забудуць і таму, што ў Барысаве актыўна дзейнічае асацыяцыя ветэранаў вайны ў Афганістане. На стварэнне музея, напрыклад, ні капейкі не ўзята ў дзяржавы. Больш мільёна рублёў хлопцы зарабілі самі. Набірае моц шматгаліновае вытворчае прадпрыемства "Полымя" пад кіраўніцтвам Валерыя Занько. Былыя воіны выпускаюць цудоўную арыгінальную мэблю, якая ўжо знаходзіць попыт у краінах далёкага замежжа. Заробленыя грошы тут пускаюць на дапамогу сем'ям загінуўшых пабрацімаў. Згуртаванне ветэранаў-афганцаў клопаты пра дзяцей загінуўшых узяло на свае плечы.

Ёсць у былых воінаў-афганцаў і праблемы. Аб іх вырашэнні гаварылі ў час пасяджэння ад імя ўрада начальнік упраўлення грамадскай бяспекі і абароны Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Генадзь Данілаў, старшыня Камітэта па сацыяльнай абароне вайскоўцаў, асоб радавога і начальніцкага складу органаў унутраных спраў, воінаў-інтэрнацыяналістаў, звольненых у запас (адстаўку) і членаў іх сем'яў пры Савеце Міністраў Сяргей Гайдукевіч, ветэран вайны ў Афганістане, пісьменнік, генерал-маёр міліцыі Мікалай Чаргінец і іншыя.

Прыйшоў на сустрэчу са сваімі былымі падначаленымі былы камандзір танкавага палка, які адным з першых увайшоў у Афганістан, а сённяшні камандарм, беларус Міхаіл Казлоў. Ніхто з іх, прайшоўшых тую праклятую вайну, не ганарыцца ёю. Але ж салдацкае брацтва, няясная надзея на тое, што кроў праліта не дарма, не пакідае іх усіх і па сённяшні дзень. Хлопцы так верылі, што ўсё гэта патрэбна для дабрабыту афганскага народа, што рэвалюцыя, якой яны дапамагаюць, нясе хлеб, асвету, сацыяльную абароненасць...

Не будзем сёння кідацца ў спрэчкі. Кампазітар Ігар Лучанок, які ў заключэнне сустрэчы, павіншаваўшы прысутных са святам абаронцаў Айчыны, сумесна са спеваком Уладзімірам Правалінскім выконваў свае песні, назваў іх антываеннымі. Што ж, няхай вайскоўцы спяваюць толькі такія песні, а беларусы, маючы на ўсякі выпадак зброю, ніколі не стануць з яе страляць.

Рэпарцёр даведаўся

Стаўкі зроблены?

Здаецца, прыжываюцца новыя, рыначныя формы работы, якія нясмела ўкараняе беларуская міліцыя.

Усяго тыдзень спатрэбіўся Ушацкаму райаддзелу ўнутраных спраў, каб затрымаць двух падлеткаў, якія цёмнай ноччу абчысцілі пасялковы гастраном на 60 з лішнім тысяч рублёў. Пасля таго, як за садзейнічанне ў пошуку злачынцаў была аб'яўлена ўзнагарода, знайшоўся сведка начнога здарэння. Падлеткі затрыманы з палічным — угнанай напярэдадні ў Наваполацку аўтамашынай і нерэалізаванымі рэшткамі ўкрадзенага тавару.

Вольга КАРАЛЕНКА.

З турмы — на фабрыку

Пачала функцыяніраваць першая ў рэспубліцы папраўча-працоўная калонія — пасяленне для жанчын.

У былы навучальна-вытворчы камбінат абласной "Сельгастэхнікі", што знаходзіцца ў Шубіне Веткаўскага раёна, прыбыло семнаццаць чалавек, якія адбывалі тэрміны ў турмах за розныя крымінальныя справы. Хутка да іх далучацца і іншыя такія прадстаўнікі "слабага полу", якія далейшае перавыхаванне цяпер будуць праходзіць на ткацкай і баваўнапрадзільнай фабрыках г. Веткі і жывёлагадоўчых фермах суседніх гаспадарак.

Віктар КОТАЎ, Белінфарм.

г.Гомель.

Пульс дня

Амерыка ім дапаможа...

Прэзідэнт ЗША Біл Клінтан паведаміў, што вывучае магчымасць павялічыць маштабы паставак у Боснію і Герцагавіну харчавання і медыкаментаў. Глава амерыканскай адміністрацыі сказаў таксама, што аналізуе прапанову скідваць прадуктовыя грузы ва ўсходніх раёнах Босніі і Герцагавіны з самалётаў ВПС ЗША. Цяпер супрацьборствуючыя бакі блакіруюць дастаўку туды гуманітарнай дапамогі аўтатранспартам.

Нечаканая місія

Група інспектараў ААН мае намер вылецець у Ірак, паведаміла агенцтва Рэйтэр са сталіцы Бахрэйна Манамы са спасылкай на заяву кіраўніка гэтай місіі Мікіты Смідовіча. Ён, аднак, адмовіўся паведаміць канкрэтную мэту візіта інспектараў ААН у Багдад і тое, чаму гэта паездка зроблена так нечакана.

Дагавор будзе?

Гватэмальскія паўстанцы выступілі з маштабнай мірнай ініцыятывай напярэдадні намечанага на аўторак у Мехіка аднаўлення перагавораў аб урэгуляванні самага працяглага ўзброенага канфлікта ў Цэнтральнай Амерыцы. У распаўсюджаным тут прадстаўнікамі гватэмальскага нацыянальнага рэвалюцыйнага адзінства (ГНРЕ) паведамленні для прэсы адзначаецца, што галоўнай мэтай прапановы з'яўляецца забеспячэнне спрыяльных умоў для хутчэйшага падпісання канчатковага мірнага дагавору.

Дэкларацыя за адзінства

Прыняццем дэкларацыі ў падтрымку патрабаванняў Афрыканскага нацыянальнага кангрэса (АНК) аб хутчэйшым правядзенні ў ПАР усеагульных выбараў і стварэнні часовага ўрада нацыянальнага адзінства тут закончылася міжнародная канферэнцыя салідарнасці супраць апартэіду.

Снягі, снягі...

Другі дзень не спыняюцца моцныя снегапады на захадзе ЗША. У некаторых раёнах штатаў Юта і Каларада спынены аўтамабільны рух. Многія дарогі проста закрыты — снегаўборачныя машыны не паспяваюць іх расчышчаць. Такога мноства снегу тут не памятаюць с 1940-х гадоў. У гарах Сьера-Невада з-за сходу снежных лавін аказаліся блакіраванымі некалькі турыстычных груп.

Трагедыя ў Рыо-дэ-Жанейра

19 чалавек загінулі і каля 20 атрымалі сур'ёзныя раненні ў выніку аўтамабільнай аварыі, якая адбылася на адной з магістралей у штаце Рыо-дэ-Жанейра. Як паведамляе тэлекампанія "Глобу", трайлер на вялікай скорасці вылецеў на паласу сустрэчнага руху і ўрэзаўся ў турыстычны аўтобус, дзе знаходзілася 50 чалавек, у асноўным дзеці. Загінулі 19 пасажыраў, яшчэ каля дваццаці ў цяжкім стане дастаўлены ў бліжэйшую бальніцу.

Знание — сила

Китай намерен предоставить больше свободы своим студентам и стажерам. Газета "Гуанмин жибао" объявила о решении руководства страны снять бюрократические ограничения для молодых людей, которые отправляются за границу, чтобы получить высшее образование или научную степень.

Либерализация в отношениях государства и покидающей Китай молодежи произошла, как говорится, не от хорошей жизни. Из 190 тыс. человек, которые в 1978—1992 годах выехали за рубеж, на родину вернулись только 60 тыс. Остальные либо продолжают учиться в США, Японии, Австралии или Западной Европе, либо — а таких большинство — после защиты диплома ищут "место под солнцем" на чужбине.

По словам представителя Государственного комитета по делам просвещения КНР Хэ Цзиньцю, Пекин отныне намерен проводить более активную и гибкую политику в отношении тех, кто желает учиться в иностранных колледжах, особенно за собственный счет. Государство будет оказывать им всяческую поддержку и поощрять выезд, чтобы китайские студенты и стажеры почувствовали, что они тоже нужны Пекину, особенно сейчас, в период реформ.

В настоящее время, согласно официальным данным, в Китае действуют весьма строгие правила на выезд. Тот, кто хочет обрести знания за границей, обязан заручиться соответствующим разрешением в органах общественной безопасности. Оно выдается лишь в том случае, если претендент от 5 до 8 лет "послужил родине".

"Китай надеется, что оставшиеся за рубежом студенты и стажеры в один прекрасный день примут участие в экономическом строительстве в своей стране", — сказал Хэ Цзиньцю.

Ранее Госсовет КНР объявил об амнистии обучающихся за пределами Китая молодых людей, которые после тяньаньмэньских событий 1989 года принимали участие в диссидентском движении, при условии, что эти студенты и стажеры по возвращении в КНР порвут все связи с созданными на территории США "антикитайскими контрреволюционными организациями".

Павел СПИРИН.

Навіны з Літвы

Бразаўскас — за нейтралітэт

На адной з першых сваіх прэс-канферэнцый пасля перамогі на прэзідэнцкіх выбарах Альгірдас Бразаўскас адзначыў, што супрацоўніцтва краін Балтыі павінна быць больш цесным і канкрэтным.

Ён адзначыў блізкасць і агульнасць інтарэсаў Латвіі, Літвы і Эстоніі, а сярод магчымых сфер супрацоўніцтва назваў выкарыстанне замежных інвестыцый, развіццё энергетыкі, спецыялізацыю портаў, расшырэнне сеткі аўтамабільных дарог. Прэзідэнт выказаў сумненне ў мэтазгоднасці стварэння балтыйскага блока па прынцыпу "Бенілюкса". На яго думку, у калектыўнай сістэме еўрапейскай бяспекі кожная з балтыйскіх рэспублік можа мець сваё месца. Ён таксама выказаўся за нейтралітэт балтыйскіх краін.

"Нічыйным" прыйдзецца пачакаць

Лёс пададзеных заяў аб грамадзянстве будзе вырашаны ў Літве ў бліжэйшы час дадатковай пастановай, якая прадугледжвае механізм практычнага вырашэння гэтай праблемы.

Вядома, гэта датычыць пераважна так званага рускамоўнага насельніцтва. Знайшлося нямала людзей, якія па розных прычынах не ўклаліся ў адведзены законам для самавызначэння тэрмін — часцей за ўсё з-за хваробы.

Цяпер створана камісія па грамадзянству на чале з намеснікам міністра юстыцыі, якая будзе рыхтаваць адпаведныя дакументы прэзідэнту, паколькі па канстытуцыі ўсе пытанні грамадзянства з'яўляюцца яго прэрагатывай. Значыць, цяпер, каб стаць падданым Літоўскай Рэспублікі, усім "нічыйным" прыйдзецца набрацца цярпення і чакаць.

Фальшываманетчыкі-віртуозы

Літву наваднілі фальшывыя купюры вартасцю 500 талонаў.

Паводле даных МУС рэспублікі, толькі ў студзені было выяўлена і выключана з абароту падробак на суму больш за два мільёны талонаў. Асабліва часта ашукваюць турыстаў з блізкага і далёкага замежжа, якія абменьваюць грошы не ў банку, а прама ў вулічных мянял.

Пошук фальшываманетчыкаў ускладняецца з-за высокай якасці падробак — на выгляд яны нічым не адрозніваюцца ад сапраўдных. Няма чаго здзіўляцца. У Алітусе паліцыя нядаўна выявіла цэлую друкарню, дзе падпольна друкаваліся фальшывыя купюры.

"Электрабалт-93" запрашае

"Электрабалт-93" — так называецца міжнародная спецыялізаваная выстаўка электратэхнікі і бытавой электронікі, якая адбудзецца ў Вільнюсе 4—7 мая.

У краінах Балтыі такая экспазіцыя праводзіцца ўпершыню. У ліку яе арганізатараў — літоўскі выставачны цэнтр "Літэкспа".

На стэндах выстаўкі будзе прадстаўлена прадукцыя вельмі вядомых фірм свету, заяўкі на ўдзел у ёй прымаюцца да сярэдзіны сакавіка.

Балтыя—Белінфарм.

ЗАМЕЖЖА * ІТАР-ТАСС * НАРОДНАЯ ГАЗЕТА *

Потребители в рыночной экономике

Решения, принимаемые потребителями в командной и в рыночной экономике, во многих отношениях однотипны: они покупают продукты питания, одежду, средства транспорта и развлечения, исчерпывая до конца лимиты своего бюджета, и хотели бы быть в состоянии купить еще. Но в общем функционировании рыночной экономики потребители играют более важную роль, чем при командной экономике. Рыночная экономика даже определяется порой как система суверенности потребителя, поскольку повседневные решения потребителей о том, на что они тратят деньги, в большой степени определяют, какие товары и услуги производятся в экономике. Как это происходит?

Покупка апельсинов и компьютерных микросхем

Представим себе, что семья — Роберт, Мария и их двое детей — отправляется купить продукты для семейного обеда. Вначале они планируют, скажем, купить цыпленка, помидоры и апельсины, но цены на эти товары могут изменить их первоначальные планы.

Они могут, например, обнаружить, что цена на апельсины возросла. Причиной повышения цены могут быть разные факторы, такие, как внезапные заморозки в районах, где разводят апельсины, погубившие часть урожая. Результатом заморозков оказывается то, что прежнее число потребителей пытается купить меньшее количество апельсинов. Если продавать их по старой, более низкой цене, продавцы распродадут апельсины еще до нового урожая. Повышение цены вынуждает потребителей покупать меньшее количество апельсинов, а производителей — выращивать большее количество апельсинов, и как можно скорее.

Существует другая возможность: поставщики могут принять решение импортировать большое количество апельсинов из других стран. Международная торговля, когда ей разрешено оперировать с относительно небольшим числом барьеров или налогов на импорт (называемых пошлинами), может дать потребителям широкое разнообразие продуктов, от апельсинов до автомобилей.

С другой стороны, урожай апельсинов может избежать заморозков, но потребители могут решить покупать больше апельсинов и меньше яблок. Другими словами, не запас апельсинов уменьшается, а спрос на них увеличивается. Это тоже будет способствовать повышению цены на апельсины на какое-то время, по крайней мере до тех пор, пока фермеры, выращивающие апельсины, не заполнят рынок вновь.

Независимо от причин повышения цены реакция на него Роберта и Марии будет, вероятнее всего, предсказуемой. Обнаружив, что цена выше, чем они предполагали, они, быть может, решат купить меньше апельсинов, чем планировали, или купить вместо этого яблоки или другие фрукты. Поскольку такое же решение примут и другие потребители, апельсины не исчезнут с прилавков. Но они станут более дорогими, и лишь люди, готовые и способные платить за них больше, будут продолжать покупать их. Вскоре, поскольку многие люди начнут покупать яблоки и другие фрукты в качестве заменителя апельсинов, цены на эти фрукты тоже поднимутся.

Но реакция потребителей — это только одна часть уравнения, определяющего цену на апельсины — спрос. Что же происходит в другой части — предложении? Повышение цены на апельсины является сигналом для всех, кто выращивает фрукты, — люди платят за фрукты больше, значит, если использовать больше ресурсов и выращивать больше фруктов, чем раньше, это оправдает себя. Фермерам, разводящим фрукты, становится также выгодно искать места под новые фруктовые сады, где фрукты подвергнутся меньшей опасности пострадать от плохой погоды. Они могут также платить биологам, чтобы те выводили новые сорта фруктов, устойчивых к холодному климату, насекомым и болезням. С течением времени все эти действия приведут к увеличению производства фруктов, и цена на них вновь понизится. Но весь процесс в целом зависит прежде всего от основного решения потребителя тратить определенную часть своего дохода на апельсины и другие фрукты.

Если потребители перестанут покупать какой-то продукт или по какой-нибудь причине решат тратить на него меньше денег — цены упадут. Если они покупают больше, увеличивая спрос, цена будет расти.

Помните, что это взаимодействие предложения, спроса и цены имеет место на всех уровнях экономики, а не только там, где товары широкого потребления продаются широкой публике. Потребление затрагивает также промежуточные товары — вводимые ресурсы, которые производители должны закупать, чтобы предоставлять свои товары и услуги. Стоимость этих промежуточных, или инвестиционных, товаров волной прокатывается по рыночной экономике, изменяя уравнение предложение — спрос на каждом уровне.

Возьмем, к примеру, полупроводниковую схему, лежащую в самом сердце современной компьютерной революции. Как и в случае с апельсинами, более высокие цены будут иметь тенденцию уменьшить спрос на компьютерные микросхемы и, следовательно, на сами компьютеры. Однако со временем более высокая цена станет сигналом для производителей компьютерных микросхем, что увеличение производства может быть прибыльным или стимулом для новых поставщиков микросхем рискнуть выйти на этот рынок. По мере понижения цены на микросхемы понизится цена и на компьютеры (предположим, что стоимость вводимых ресурсов останется неизменной) и спрос на них начнет расти.

Спрос на компьютеры не только подтолкнет поставщиков к увеличению объема производства. Он также будет способствовать нововведениям, результатом которых станет усовершенствование микросхем и появление более мощных и более эффективных компьютеров — конкуренция прогресса и цен, происходящая практически на всех подлинно свободных рынках.

Цены и доходы потребителей

Другим экономическим фактором, который должен принимать во внимание потребитель, приобретая товары и услуги, является его собственный уровень доходов. Большинство людей получают доход от работы, которую они выполняют в качестве врачей, плотников, учителей, слесарей-водопроводчиков, рабочих на конвейере или продавцов в универсальном магазине. Некоторые получают доход от аренды или продажи земли и других природных ресурсов, которыми владеют, или в качестве прибыли от бизнеса или предприятия, или в виде процентов на лежащий в банке капитал или иные капиталовложения.

Ниже мы расскажем о том, каким именно образом устанавливаются цены на подобные выплаты, но сейчас важно иметь в виду следующие пункты: 1) при рыночной экономике основные ресурсы, используемые для создания товаров и услуг, удовлетворяющих спрос потребителей, находятся в руках частных потребителей и семей; 2) выплаты, или доходы, которые семьи получают за эти производственные ресурсы, поднимаются и падают — и эти колебания имеют непосредственное влияние на те суммы, которые потребители готовы платить за нужные им товары и услуги, и, следовательно, на уровень объема производства фирм, которые производят эти продукты.

Возьмем в качестве примера работницу, которая только что вышла на пенсию и получает теперь только около 60 процентов тех денег, которые получала, пока работала. Теперь она сократит расходы на многие товары и услуги — особенно те, которые были связаны с ее работой, как, например, транспорт на работу и с работы и рабочая одежда, — но может увеличить расходы на другие виды продуктов, скажем, на книги и предметы досуга, требующие больше свободного времени; быть может, она поедет путешествовать, чтобы повидать новые места или старых друзей.

Если, как это происходит сейчас во многих странах, число людей, достигающих пенсионного возраста, быстро увеличивается, связанные с этим изменения модели расходов затронут все рыночные цены и уровни объема производства данной продукции и многих других продуктов, которыми пенсионеры пользуются больше, чем большинство других людей, как, например, здравоохранение. В ответ на это некоторые предприятия решат производить продукты и услуги, отвечающие интересам и запросам пенсионеров — поскольку производство этих товаров становится прибыльным.

Подведем итог: является ли потребитель молодым или старым, женщиной или мужчиной, богатым или бедным или он относится к среднему классу, каждый потраченный им доллар или песо, или фунт, франк, рупия, марка или иена является голосом, поданным в экономическом избирательном процессе и сигнализирующим производителям, какие товары или услуги они хотят видеть на рынке.

Расходы потребителей являются основным источником спроса на продукцию, продаваемую на рынке; это представляет собой половину того, что определяет рыночные цены на товары и услуги. Другая половина основана на решениях, принимаемых бизнесами, о том, что производить и каким образом.

Калі карабель дае цечу...

Аляксандр БАХАНЬКО

Сінгапурскія суднарамонтныя кампаніі працвітаюць пасля закрыцця на Філіпінах у канцы мінулага года ваенна-марской базы ЗША Субік-Бей.

Мільённыя кантракты на рамонт амерыканскіх караблёў, які вёўся раней філіпінскімі рабочымі, цяпер дасталіся Сінгапуру, дзе знаходзіцца адна з самых буйных суднаверфяў у Азіі.

За мінулы год на абслугоўванні і рамонце караблёў 7-га флоту ЗША сінгапурскія кампаніі зарабілі каля 47 млн. долараў. Суднарамонтная кампанія "Сембаванг шыпярд лімітэд", напрыклад, атрымала ў чэрвені мінулага года 4 млн. долараў за рамонт амерыканскага карабля "Інгерсол". Аднак заключыць кантракт з Пентагонам — не такая ўжо простая справа. Як заявіў упраўляючы дырэктар "Сембаванг шыпярд лімітэд" Тан Монг Сенг, амерыканскі флот прад'яўляе вельмі жорсткія патрабаванні да рамонту і абслугоўвання сваіх суднаў.

Чакаецца, што ў гэтым годзе сума выплат за абслугоўванне амерыканскіх баявых караблёў і суднаў суправаджэння можа дасягнуць 100 млн. долараў.

Пра школу ў чорна-белых танах

Выкладанне і ўмовы вучобы ў школах для афрыканцаў могуць быць даведзены да ўзроўню школ для белых грамадзян ПАР толькі ў пачатку будучага стагоддзя. Аб гэтым заявіў у Кейптаўне міністр нацыянальнай адукацыі краіны Пітэр Марэ.

Ён расказаў журналістам аб рыхтуемых пераўтварэннях у сістэме школьнага навучання.

П.Марэ адмовіўся назваць дакладную дату, калі будзе дасягнуты "парытэт" паміж школамі для чорных і белых паўднёваафрыканцаў. Разам з тым ён указаў, што яго ведамства прыкладае ўсе намаганні для таго, каб гэта адбылося як мага хутчэй. Паводле слоў міністра, пераўтварэнні заклікаты закласці аснову для ліквідацыі перажыткаў апартэіду ў школах раёна.

Як паведаміў П.Марэ, мяркуецца стварыць адзінае міністэрства нацыянальнай адукацыі, якое заменіць чатыры існуючыя ведамствы, што займаліся пытаннямі асветы ў кожнай з этнічных абшчын. Ён указаў таксама, што ўрад не лічыць неабходным скасаванне школ толькі для белых паўднёваафрыканцаў. Але пры гэтым яны будуць пазбаўлены дзяржаўных датацый.

